Алесь Аркуш

# АДЗНАКІ
# ПАМЕЖНІКА ЧАСУ

Полацкае ляда
2012

# НЯ Ў НАС УСЁ
# АЛЕ ПРАЗ НАС

* * *

зьдзівіцца нечаканай праўдзе

як усё проста
калі геніяльна

толькі аблушчанае ядро
зь якога праклюнецца працяг

ні лішняга слова
ні калючага асьця

толькі адзнака ў пашпарце
памежніка-часу

* * *

калі першыя маразы
пачынаюць па начах
шкліць чорныя калюгі
заўважаеш —
вада ў Дзьвіне
без удзелу эколягаў
і станцыяў водаачысткі
робіцца ўсё больш
празрыстая
і сьцішаная
вялікая рака рыхтуецца
да адпачынку

нібыта пад гіпнозам
паўнатварага месяца

які не міргаючы
глядзіць у рачныя хвалі

яшчэ некалькі дзясяткаў сэансаў
і рака здасца —
з галавой схаваецца
пад коўдраю лёду
і засьне

* * *

сабаку накарміць
прылашчыць
зазірнуць у вочы
сказаць добрае слова

выйсьці на шпацыр

паслухаць як шамацяць ільдзіны —
абуджаная Дзьвіна
як авечыя статкі
гоніць іх
на кірмаш у Рыгу

песьня вялікай ракі ў адліжную зіму

прайсьціся ўздоўж берага
нічога не кранаючы
не пакідаючы сьледу

укінуць у раку закаркаваную бутэльку
зь лістом да грамадзянаў сьвету

* * *

дзіўная гэтая гісторыя
як надышла цяперашняя зіма

яна дзейнічала па ўсіх правілах
захопніцкай вайны
калі трэба надзейна акупаваць
чужую тэрыторыю

спачатку зіма рабіла выгляд
што ёй ні на чым не залежыць
і яна ўвогуле не збіраецца
прыходзіць

да самых калядаў было цёпла

і калі людзі адгулялі
свае галоўныя сьвяты
калі яны згубілі пільнасьць
зіма заатакавала

спачатку некалькі дзён
ішоў сьнег
сьцяной
як абстрэл мільёна лучнікаў
або незлічонай артылерыі

затым у бой уступілі
асноўныя сілы
маразы

яны ня ведаюць літасьці
а іхны ваявода Зюзя
проста монстр

і вось поўная перамога

для пераможцы сьвеціць сонца
гучаць гімны
нават безгалосых вераб'ёў
прымусілі сьпяваць

на крыжы Сафійкі
сядзіць чорны крукач

* * *

*Данілу*

пачнем спачатку
каб унікнуць канца

самы надзейны спосаб

гэта нават не вяртаньне
хутчэй адмысловы працяг

пазьней я пакажу табе
свае любімыя мясьціны:
рачулку што блукае між пагоркаў
і заімшэлых вялікіх камянёў —
нібыта зачараваныя валадары
яны ахоўваюць велічнае навакольле

дрэвы тут шапочуць
без дапамогі ветру

ўсё гэта будзе тваё

бо нельга забраць у чалавека тое
што ён любіць

як нельга адабраць у неба
аблокі

кожны нараджае сваю любоў
але ёсьць тая любоў
якая нарадзіла цябе
　　　　ня ў нас усё
　　　　але праз нас

* * *

на белым пяску ўздоўж ракі
дзіўныя сьляды і калдобіны
нібыта чужаніцы-кракадзілы
рабілі тут кладкі
сваіх яек

учора бульдозэры працавалі
тлумачыць Тацяна
горадзкія ўлады вырашылі
ўпарадкаваць набярэжную

нібыта шматмоўныя Бураціны
з усяго сьвету
хавалі тут свае залатыя

дзятва
як гракі за плугам
веснавым
выхопліваюць з ворыва
барацінкі

* * *

сярод чаратоў
схавалася маленькае
гнязьдзечка
з адным яечкам
з іголкай зачараванай
усярэдзіне

так так
з той самай славутай іголкай
у якой жыцьцё цмока
захоўваецца

дый што тут паробіш:

і балота шкада асушваць
і гняздо дратаваць
і яечка біць

* * *

нечага не хапае ў кватэры
думка гэтая падсподна
зумкае ў галаве
як сыгналізацыя легкавіка
што спрацавала сярод ночы

нарэшце зразумеў
прычыну неспакою

старэйшы сын Антось
скончыў музычную школу
і здаў настаўніку клярнэт

а я так і не запомніў
колькі ў клярнэце
клавішаў спружынных

* * *

ты кажаш
памыліўся ў чалавеку
маўляў
чакаў ад яго нечага істотнага
і лёсаноснага —
 не дачакаўся
 і зараз пачуваесься
 падманутым і зьнявераным

 дарма так лічыш

 ніводзін чалавек на сьвеце
 ня можа табе даць
 прадмет твайго чаканьня

 бо нельга даць чалавеку любові
 калі ён ня любіць

 бо нельга нічога ўзяць
 не працягнуўшы сваёй рукі

 і яшчэ зразумей
 ён —
 толькі часьцінка нечага
 толькі сэгмэнт
 толькі чалавек

* * *

былыя кадэбоўцы і сьмершаўцы
зь сівымі фрызурамі і каменнымі тварамі
грэюцца на лавачках у парку
прамотары веку атэізму
з трывогай пазіраюць
у бок бліскучазалатога купалу сабору
карціць зайсьці ў бажніцу
і паставіць сьвечку
ды відзежы пераймаюць
ля царкоўнае брамы
так страшна памерці

* * *

на дракары між аблокаў
вяслуе сьвяты Торвальд
шляхам з варагаў у Полацак

месяц гойдаецца лунніцай
зоркі паміж пальцаў
вялікі крыж на ветразі

толькі гэты крыж і бачна
час ад часу сярод аблокаў
крыж Торвальда

## *ЯНКА ЖУРБА*

Як гэта па-эўрапейску:
паміраць у поўнай галечы,
сьляпым,
забытым чытачамі, калегамі, уладамі,
выдаўцамі, гісторыкамі, партыйнымі кіраўнікамі
рознага ўзроўню, ідэалагічнымі аддзеламі,
настаўнікамі роднай мовы, кіраўнікамі
гурткоў мастацкага слова, былымі падпісчыкамі
газэты «Наша Ніва»...

Як Мадыльяні, альбо Кафка, альбо Норвід...

Што заставалася ў спадчыну? Пустка,
на якой наканавана было зьявіцца
тваёй магіле. Навошта тлумачыць, ведаеш сам:
на пустках нетрывалыя нават пахаваньні валадароў.
Ці мусіш чакаць лепшай долі?

Няўтульна пачуваць сябе
дагістарычным выкапнем, да якога
зрэдку, з нагоды круглай даты, прылятаЛі на самалёце
беларускія савецкія пісьменьнікі.
Зьбіралі іх у дэлегацыю па Дамах творчасьці і
лецішчах на Нарачы,
і везьлі ў Полацак на экскурсію —
паглядзець на Янку Журбу.

Ты не такі як яны,—ты і яны гэта выдатна
разумелі,—ты дакастрычніцкі,
і гэтае вызначэньне, як Дамоклаў меч,
вісела над тваёй галавой.

«Чаму Вы не прыходзіце да нас на літаб’яданьне?» —
запытаўся ў паэта аднойчы юнак, які стаў затым

савецкім паэтам. «Малады чалавек, я тут хаваюся,» — адказаў яму Журба.

І ўсё ж на нешта ты, дзядзька Янка, спадзяваўся —
ці то на цуд,
ці то на вышэйшую, боскую справядлівасьць,—
бо пасяліўся побач са Спаскай царквой,
бліжэй да Эўфрасіньні Полацкай.
Тут непадалёк цябе і пахавалі —
на Ксавер'еўскіх могілках.

Гэта адзіная магіла, на якую
я прыходжу ў гэтым горадзе.
Сьпі спакойна, паэце,
я цябе не забуду.

## *ВАВЭЛЬ*

Каля абарончых муроў Вавеля бутафорскі дракон
пэрыядычна
дыхае полымем у бок Віслы,
але зусім ня страшна
нават маленькім дзецям,
якія са сьмехам абступілі страшыдлу
як факіра на сьвяточным кірмашы.
Я зноў блукаю ля тваіх муроў — Вавэль,
здаецца, ведаю цябе зь сівой даўніны
столькі ж, колькі гэтыя *Пагоні* на тваіх
брамах і сьценах.
Скачуць вершнікі да роднага Полацку,
нясуць весткі з Вавэля —
не загады, бо ня любіць Полацак загадаў, —
толькі весткі пра інтрыгі, балі і фаварытаў,
альбо просьбы аб вайсковай дапамозе;
ня шмат тваіх слаўных сыноў, Полацак,
наведвалі гэтыя шыкоўныя залі,
ступалі на гэты ганаровы брук,
дзівіліся з гэтых шэдэўраў-габэленаў,
якімі шчодра завешаны сьцены палацу;
а хто і патрапляў сюды,
на вочы караля суседняе краіны,
ці заўсёды ён памятаў пра цябе,
вялікі Полацак?
Ці не асьляпляла яго багацьце
і пашанота двара манарха?
Ці не прачыналася тут, сярод бляску
і велічы, пачуцьцё зайздрасьці і сваёй
непаўнавартасьці?
І тады, забыўшыся на гонар,
сьпяшаліся зайздросьнікі засьведчыць
сваю адданасьць чужому каралю,
зракаліся сваіх звычаяў, традыцыяў, мовы,

забыўшыся на цябе, Полацак.
Быў у гэтых краёх, прынамсі, адзін палачанін,
які выправіўся юнаком у далёкі Кракаў,
звалі яго Францішак;
толькі не блукаў ён па каралеўскіх залях,
не разглядваў біблійных сюжэтаў
на вялікіх — на ўсю сьцяну — габэленах,
не частаваўся смажанай алянінай са стала манарха —
па веды выправіўся ў чужаніцу Францішак.
Я ступаў на тыя самыя сходы,
па якіх хадзіў дапытлівы палачанін,
гукаў у тыя самыя сутарэньні,
якія памятаюць голас юнака зь берагоў Дзьвіны,
дакранаўся да сьценаў храму навукі,
якія захоўваюць цеплыню ягоных далоняў,
пытаўся ў прафэсараў: як пабачыць земляка?
Усе паціскалі ў адказ плячыма.
Дзіўным чынам я знайшоў яго...
На хвіліну Скарына адарваўся ад пільнага занятку
і, як сучасны кампутар, імкліва счытаў з майго твару
апошнія навіны з Бацькаўшчыны.
Ня буду доўга замінаць, дружа Францішак,
о! колькі наперадзе ў нас працы!
Да пабачэньня! Плёну дзеля велічы роднага Полацку!
Вечарам зь сябрам выправімся
ў містычную рэстарацыю «Ружы і кроў»,
дзе замовім чырвонага віна,
якое, перш чым наліць у нашыя фужэры,
даюць пакаштаваць на смак.
Мы вып’ем за Полацак і за тваё здароўе, дружа Францішак!

Я буду па-беларуску
апавядаць сябру пра чароўнае месца,
дзе Палата сустракаецца зь Дзьвіною,
дзе Ян Баршчэўскі напаткаў свае фантастачныя прыгоды,
дзе Ластоўскі шукаў таямнічыя лябірынты...
Мой суразмоўца, які ніколі ня быў у Полацку,
будзе ветліва слухаць,
часам незаўважна пакідаючы цьмяную залю-сутарэньне
дзеля якіхсьці тэрміновых развагаў і думак.
Я гатовы апавядаць гэтым сьценам, манэкену мніха,
які стаіць за маёй сьпіной,
і нетаропкай афіцыянтцы...
Заўтра Вавэль будзе такім самым, якім памятаю яго з
мінуўшчыны,
і пазаўтраму, і праз год, і праз стагодзьдзе,
і толькі Полацак будзе мяняцца:
адновіцца ўнівэрсытэт, вярнуўшыся ў муры былога
Езуіцкага
калегіюму,
адбудуецца сабор сьвятога Стэфана,
паўстануць помнікі героям, якія праславілі места,
народзіцца пантэон выбітных людзей Краіны,
а пад старажытнымі скляпеньнямі ўніверсытэту
зноў галава Дзядка, якая ўмее гаварыць на тузіне
эўрапейскіх моваў, будзе даваць парады полацкім шкалярам.
Калі ты прыедзеш адпачыць да нас у Полацак,
я абавязкова зваджу цябе да гэтай разумнай галавы,
каб ты сам-насам запытаўся ў яе пра ўласнае патаемнае,
пасьля чаго я правяду цябе па полацкіх лёхах
да самых Бельчыцаў,
дзе мы зойдзем у рэстарацыю «У братоў базыльянаў»,
замовім чырвонага віна і вып’ем за цябе, Вавэль!

*Кракаў-Полацак, травень 1999 г.*

## *УСЯСЛАЎ*

Паперадзе шыхтоў ваярскіх,
Еднасьць дэманструючы і сьмеласьць,
Радзімы сьцяг трымаючы ў руках,
Аднекуль, як з самое аблачыны,
Містычна князь Усяслаў зьявіўся на кані.
О! Як прыгожа ён узьняў свой меч!
О! Як высока ўзьляцелі родныя аблокі!
О! Як сувора ў дзідах вецер адгукнуўся!
Гул па шыхтох панёсься: Усяслаў!!!
Аднолькава загрукалі ў грудзёх крывіцкіх сэрцы.

## *ВЯРТАНЬНЕ Ў ПОЛАЦАК*

Нас будуць сустракаць як Гагарына,
Шампанскае адкаркоўваць на гаўбцах.
Мы плануем вяртацца па бульвары Скарыны.
З пажарнай вежы на галовы сыпануць канфеці.

Наперадзе нашай калоны будзе граць «Стары Ольса»,
А над галовамі імчацца дэльтапляны.
Вінцэсь Мудроў будзе шпацыраваць босы
Са сьлязой на шчацэ і ад шчасьця п'яны.

Каля помніка Францыску Скарыну
Наша калона прыпынецца на хвіліну.
Прамову скажа Лявон Баршчэўскі
Пра тое, што Скарына быў малец някепскі.

Затым калона рушыць далей па бульвары,
А Сокалаў-Воюш дастане сваю гітару,
Будзе сьпяваць пра невядомага касінера,
Які аддаў жыцьцё, каб не зьнікала наша вера.

Ля помніка Цэнтру Еўропы
Уладзя Лобач распавядзе легенду пра цыклопа,
Новую, запісаную ў апошнюю экспедыцыю,
Якую ладзілі студэнты на Верхні Замак за бальніцу.

Каля Сімяона Полацкага Якуб Лапатка
Будзе чытаць вершы манаха гладка
У перакладзе на фінскую мову, мовячы,
Каб было зразумела нават на поўначы.

Ну а ля помніка «У нескладоваму», ад перадозы любові,
Уладзя Арлоў насьмеліцца прасьпяваць песьню Бон Джові.
Яму падыйграюць на губных гармоніках
Аніса і Ален — два рокеры-законнікі.

І я там быў,
Кока-колу піў,
Чытаў вершы ля помніка Тарычу,
            еў вінаград і алычу,
            пра астатняе прамаўчу.

* * *

На жаль, машына часу не існуе,
Каб выправіць памылкі ў мінулым.
Зайсвойваць урокі застаецца,
Канспектаваць, як пачаткоўцам-вучням,
Не прамінаючы ніводнае драбніцы
З падзеяў прамінулых і вірлівых,
Высновы робячы ўласнымі глуздамі,
Ня слухаючы голасу чужынцаў,
Гартуючы ў сабе змагарскі дух.

Тады адрозьніш ты беспамылкова
Гук таямнічы, гук тваёй свабоды,—
Нібыта пошум хвояў гонкіх,
Ці зумканьне чмяля над кветкай канюшыны,
Ці сьвіст стралы, што ведае свой шлях.

То будзе граць сурма ў дзень паводкі,
Якая нечакана завіруе
Вакол цябе шалёным карагодам,
І панясе, і панясе на хвалях моцных
Маленькі карабельчык тваёй мары,
Адкрыўшы для яго ўвесь сусьвет.

І гэта будзе сьвятам разьвітаньня
Зь мінулым-застаялым, шэрым, нудным,
З самім сабой, якім ты быў раней.

І гук сурмы надзвычай узмацніцца
Калі твой сьцяг нарэшце залунае
Вышэй за ўсе вязьніцы на Зямлі.

## *ПОЛАЦКІЯ ТРОХРАДКОЎІ*

* * *

Ля Сафійскага сабору
над вежамі-званіцамі
разглядаю зорку

* * *

Вікінгі
мінаюць Полацак
заўжды ўночы

* * *

Асірацела Дзьвіна
без паруснікаў
апошні — на гербе горада

* * *

У Спаскай царкве
рэха асаблівае —
мінулае побач

* * *

Дзівосны сон:
у мніха набыў мапу
полацкіх лабірынтаў

* * *

Ля Валовай азярыны
Пярун зьяўляецца
кожную навальніцу

* * *

На санках ляцець
са схілу Замкавай гары
насустрач непрыяцелю

* * *

У дворыку Езуіцкага
калегіюму працуюць археолагі:
грукаюць рыдлёўкі аб цэглу

* * *

нібыта пруткая трава
нібыта карэньні
магутных дрэваў
уздыбілі асфальт
на цэнтральных вуліцах
сівагаловага Полацку

гэта абудзілася
старая брукаванка
кажа мне Ян

гэта людзі полацкіх сутарэньняў
шукаюць выйсьця
кажа мне Власт

гэта пачынаецца
новае стагодзьдзе
кажа мне ўнутраны голас

# ПОБАЧ ПЛІСА ГАЙДАЕ НА СВАІХ ХВАЛЯХ БЕЛАТВАРЫЯ ЛІЛЕІ

* * *

у Жодзіне на мосьце
пад якім шуміць вадаспад
гляджу на гульню пырскаў

усплываюць відзежы
дзяцінства

трансьляцыя праз дзесяцігодзьдзі

Пліса ашчадна
(даражыць кожнай кропелькай)
коціць свае воды
у Бярэзіну

вадаспад як мытня
кожная кропелька
праходзіць агляд

недзе там унізе
пад замшэлым каменем
схаваўся мянтуз
з маім залатым кручком
у роце

* * *

прызначыў табе спадканьне
на брызгалаўцы
ля трэцяга фантану

табе

мая срэбная
платвічка

* * *

на Судабоўскім возеры
ў чаратах
схаваў з сябрамі
човен
і ніяк знайсьці не магу

шукаю ўжо сорак чатыры гады

бо ў тым чоўне
пакінуў свой
шчасьлівы рыбалоўны
кручок

а без яго не шанцуе
хоць ты плач

* * *

на царковішчы
засталіся
апошнія волаты-ліпы

ты добра памятаеш
як раней яны суладна
цьвілі штотравень

казачная краіна
з кветак і пчолаў

на месцы царквы
пабудавалі
прадуктовую краму

а неўзабаве
пачалі зьнікаць ліпы

ліпы тваёй казкі

дзякуй дарагія
што часам
прыходзіце ў сны
і дасылаеце
вестачкі праз пчол

* * *

зь дзяцінства ня меў
якіх-кольвечы здольнасьцяў
да музыкі
таму ў суседзкі ДК ДРЭС
які дасюль месьціцца
на стромкім беразе Плісы
хадзіў зь дзьвюх нагодаў

на танцы
або ў клюб калекцыянэраў

танцор у выніку зь мяне
ня выйшаў
а калекцыянэрам застаўся
на ўсё жыцьцё
    зьбіраю
    позванкі імгненьняў
    значкі гісторыі
    і манэты ўнікнёнасьці

* * *

што з гукамі
е у а

еду па вуліцы
ранкам на ровары

вецер у твар

радасна

* * *

у родным Жодзіне
мой чатырохгадовы сын
засвойвае электрамабіль
які некалі зьбіралі для мяне

але так доўга
што за гэты час
я істотна падрос
і ўжо ня ўлажу
у кабіну цуда-аўто

пакуль што сын навучыўся
ехаць толькі наперад
і калі яму трэба
скіравацца назад
ён вылазіць з кабіны
уручную разварочвае аўто
і працягвае шлях
націскаючы на понаж газу

можа гэта і добра
што яму ніяк не даецца
навука задняга ходу?

можа і ня трэба
яго навучаць гэтай
жыцьцёвай прамудрасьці?

* * *

шлях ад электрычкі
да матчынага дому

колькі разоў ім кіраваўся!

у розныя бакі

і вельмі рана-раненька
і ўдзень і ўночы

нёс думкі і мары

а яшчэ
матчына блаславеньне
і клопат і трывогу

пакуль гэты шлях існуе
датуль я прывязаны пупавінай
да цябе
мой родны горад

* * *

сябар-аднаклясьнік
запрасіў да сябе ў госьці

сядзім ля става на лавачцы
і згадваем маладосьць

побач Пліса гайдае на сваіх хвалях
белатварыя лілеі
а за ракой
пачынаецца знаёмы лясок —
зялёным пасам ён выцягнуўся ў бок
карпусоў піянэрлягеру
у якім штолета ты бавіў
вольны час свайго дзяцінства

ці растуць зараз у тым ляску
суніцы?

ці грэюцца на іглістых сьцежках
яшчаркі?

ці хаваюцца пад маладымі елачкамі
сямейкі масьлякоў?

ці варта ўсё гэта спраўджваць?

* * *

на сайце *Аднакласьнікі*
чакаю вестачак
ад сяброў дзяцінства

толькі адны
тую вестачку даслаць
ужо няўзмозе

а другія...
другія і ня ведаюць
пра сайт *Аднакласьнікі*

## *ПЛАЦІНА*

Сяджу над плацінай, як Бог над сусьветам,
Вясёлка ўнізе між пырскаў мне сьвеціць.
Уверсе каметы — як авіяшоў -
Па парах ляцяць, паглядзі, проста шок.

Вада аглушае, як выступ Грэнд Фанка,
Хоць гэта Пліса, а ня арыі Ганга,
Сваёй гіпнатычнасьцю вабіць, як Вій,
Гучаць мае модлы: не ўкрадзі, не забі.

Дарэмныя толькі мае хваляваньні,
Плаціна пра іншае думае ўраньні:
Калі першы промень кранецца вады,
Ты надпіс убачыш, які праз гады

Выразна ільсьніцца на засаўцы шлюза -
«Люблю цябе Таня». Няма ўжо Саюза,
Няма тых людзей, што плаціну ўзьвялі,
А надпіс жыве й будзе жыць на зямлі.

## *ПРАГУЛКА НА БЕЛАЗЕ*

Даўнюю маю мару — праехацца на БелАЗе
Па вуліцах роднага Жодзіна:
Сігналіць красуням-модніцам,
Трымаць нагу цьвёрда на газу.
Заеду на стадыён «Тарпеда»,
Каб круг зрабіць з развароту,
Адзін, каб пасьпець да абеду
Вярнуць аўто для завода.
Затым парулю на Брызгалаўку,
Каб змыць пыл дарожны з твару.
Дазволю на белазаўскую палубу
Узьняцца якомусь маламу.
Дазволю ўявіць пагоню,
Крыкнуць на ўсё горла:
Нас ніхто не дагоніць!
Нас ніхто не дагоніць!
Затым пракачуся да ДРЭСа
Па родных з маленства сьцяжынках.
Будуць мець добрага стрэса
Улады свае — з Дзяржынкі.

## *СЬВЯТЛО ВЯСНЫ*

Вясной сьвятло зусім іншае. Яно лагоднае. Не, інакш. Яно галаграмнае. Яно набывае новыя аб'ёмы, новую глыбіню. У яго можна ўвайсьці і зьнікнуць. Заблукаць, заблу-каць, за-блу-каць... у празрыстасьці.

Калі аблокі нібыта кранаюць верхавіны таполяў. Калі дрэвы яшчэ голыя, але ўжо абуджаныя. Ахутаныя сьвятлом. Ствалы, пасьвятлеўшыя, вільгатнеюць ад хваляваньня.

І яшчэ — сьвятло радаснае. І гэтай радасьцю кранае цябе.Як дзявочы дотык. Выпадковы. Нечаканы. Які — ты гэта ведаеш — насамрэч інсьпіраваны, і ад гэтага веданьня табе радасна і сьветла.

Ты выходзіш на двор у вясну. Дакранаешся рукой да сьцяны свайго цаглянага двухапавярховіка і з прыемнасьцю грэеш далонь.

О, гэта ужо вясна сапраўдная! Яна грэе тваю далонь і кліча ў квецень.
Ад зыркага сьвятла ты мружыш вочы, сам сабе пасьміхаешся. Сьвятло цябе кранае радасьцю. Канікулы. Нікуды ня трэба сьпяшацца.

З раніцы ты чытаў кнігу. У галаве яшчэ засталіся малюнкі сюжэту. Штосьці пра вандроўкі па далёкіх, дзіўных, экзатычных краях. І гэтыя малюнкі няўзнак накладаюцца на звыклы «трафарэт» твайго двара, надаючы навакольнай звыкласьці нязвыклую рамантычнасьць.

Недзе ў гэты час звычайна прыходзіць паштарка. Ты чакаеш яе. Стаіш ля свайго пад'езду і выглядаеш кабету з цяжкай, брухатай сумкай.

Яна з'явіцца ўсё адно нечакана, выйдзе з-за рогу твайго дому, недзе ў пяці мэтрах ад цябе. Звыклым пасьпешным крокам. Пройдзе побач. Ты не падаш выгляду, што яе чакаеш. Павітаешся. Затым вытрымаеш паўзу. Кабета выйдзе з твайго пад'езду і схаваецца ў суседнім. Вось цяпер пара.

Некалькі крокаў і ты ля паштовых скрыняў, што вісяць побач з дзьвярыма бацькоўскай кватэры. Сёньня павінна быць літаратурная старонка ў мясцовай газэце. І ў ёй твае вершы. Пра вясну.

* * *

рукі на ўзроўні плеч
не
гэта не фіззарадка
у дзіцячым летніку
«Чайка»
і гэта не разьмінка
на ўроку фізкультуры
пад кіраўніцтвам
Баніслава Станіслававіча
у СШ №1 імя Пятра Купріянава

рукі на ўзроўні плеч
і порстка-порстка
перабіраючы нагамі
рухаючыся па колу
хутчэй яшчэ хутчэй
адзін за адным
па колу па колу
хутчэй хутчэй

мільгаюць вокны
толькі вокны якія
пакінулі рамы дамоў
толькі вокны разпазнаеш
у гэтым шалёным тэмпе
лязгінкі

* * *

марыць па-сапраўднаму
гэтага ў нас ніхто не адыміць
пра што — не істотна
бо марыць —
як мець надзею
на лепшае і сьветлае
і не істотна што сьвет
як дзіцячы калейдаскоп
пры кожным руху
укладае новы малюнак
з прастакутнікаў ромбікаў
трохкутнікаў і кружочкаў —
падставовых матэрыялаў
для любой сур’ёзнай справы

мара — гэта вочка калейдаскопу
глядзець у якое дазваляецца
у час гульні зь дзецьмі
у час сьвята нашага таямнічага
і ў свой апошні час

# Я ПАЧУЮ
# Я АДГУКНУСЯ

## *РЭХА МІЖ КАМЯНІЦАЎ*

скрозь Вострую Браму
мінаем, як скрозь магічнае
шкло і трапляем
у іншы сьвет

ня ведаю, ці выпадзе
нам сустрэцца ў
тым іншасьвеце

бо ты намагаешся
яго ўбачыць —
нібыта сьвет толькі тое,
што можна ўбачыць

а я спрабую пачуць —
нібыта гук больш трывалы
за камень

беспрытульнае рэха
нястомна блудзіць
між камяніцаў,
зазіраючы ў вокны

толькі рэха

* * *

на Літарацкай горцы
на могілках Роса
Аляхновіч абдумвае
новую п’есу

пра што тая п’еса?

пра вечнасьць
якая кіруе
зорамі на небе

пра сум
які незварушна
пільнуе магілу

пра час
які бязьлітасна
нахіляе да зямлі
помнік

## *МАКСІМ, ЯКІ НАЗВАЎ СЯБЕ ТАНКАМ*

ніколі не размаўляў
з гэтым чалавекам
не атрымаў
ніводнага аўтографа
ніколі не вітаўся
за руку
ніколі не прасіў творы
для «Калосься»
і ніколі ня браў інтэрв'ю

толькі чытаў вершы
толькі чуў пра яго
легенды
нат і ня верыцца
што быў
такі
чалавек
Максім Танк

* * *

беларускае слова
чую ў сабе
аб’ёмна
з рэхам

* * *

бляклае сьвятло месяца
ледзь прыкметная дарога
і ўсё
і больш нічога
толькі поле і дарога
у нікуды
да месяца
 і зор

## *ВЕЧАРОВЫ ШПАЦЫР ПА ВІЛЬНІ*

* *

шпацыраваць па дахах Вільні!
дзівак!
ты напэўна ўяўвіў
што ўсе таямніцы горада
чакаюць твайго прышэсьця

* *

ісьці па вечаровай вуліцы
пасьміхацца
і насьвістваць мэлёдыю
ігнаруючы аўтарскія правы
Джона Пола Джорджа і Рынга

* *

дзень старанна
зьбірае
дробныя манеткі
а ноч
імі шчодра
разьлічваецца

* * *

я дзяжурны па станцыі
на рэальнай чыгунцы — там дзе рэйкі і шпалы
там дзе таварнякі цяжка гружаныя
з двух бакоў шчыльна атачылі твой экспрэс
які ляціць з Полацка
у зіхатлівую калядную Вільню

ліхтарык у руках мігціць —
упрошвае таварнякі растуціцца
вызваліць шлях экспрэсу
у якім імчыцца да мяне мая каханая

## *ПРА ГАЗЭТУ*

з газэты можна зрабіць
самалёцік або карабельчык
і нельга — аўтамабіль
бо газэта ўмее
толькі лётаць і плаваць

як далёка
гэта іншая справа
справа ветру
і рачной плыні

## *ЧАМУ ПРАЎДА ТАКАЯ СЛАБАЯ?*

* *

ня раз задаваў сабе пытаньне
чаму праўда такая слабая
а хлусьня такая моцная
а сёньня падумалася
праўда заўсёды слабая
на гвалт і прымус
і заўсёды моцная
на веру і справядлівасьць

* *

хлусьня гэта драўляныя салдаты
Урфіна Джуса
бяз сэрца без спагады
не працягвай руку хлусьні
не спрабуй зь ёй паразумецца
бараніся праўдай

* *

хлусьня як атрутная жамяра
якая мусіць уджаліць
каб упырснуць сьліну няверы
найлепшая прышчэпка — трымацца свайго

* *

у хлусьні кароткія рукі
каб схаваць Каліноўскага
каб прымусіць маўчаць Купалу
каб забраць грамадзянства БНР
у Ларысы Геніюш

* * *

сказаць два словы:
гаворыць Вільня —
і ведаць,
што цябе пачулі
ў родным Полацку

## *ВІЛЕНСКІЯ ТРОХРАДКОЎІ*

* *

На Гедэмінавай гары
пад нагамі турыстаў
шукаю магілу героя.

* *

Няўжо і ты, Вільня,
спадзяешся на літасьць
лёсу ў год каня?

* *

Вось і ноч скончылася,
а над Вільняй
ня гаснуць зоркі.

* *

Нічога не пакінуў Вільні —
толькі цьмяныя сны,
толькі мроі.

* *

Гукні мяне, Вільня, —
я пачую,
я адгукнуся.

# ВЯСНА ПРЫЙШЛА Ў ЛЮТЫМ І ЎСЁ ПЕРАБЛЫТАЛА

* * *

над крыжамі
беластоцкага фарнага касьцёлу
завісла воблака
што ляцела з Полацку
на захад

усьлед за сонцам
усьлед усьлед

каб ніколі не засынаць

ляцець і ляцець
ляцець і ляцець

але так стаміў
воблака
шлях над Беларусяй
што яно
адолеўшы мяжу
вырашыла адпачыць

а лепшага месца для адпачынку
чымся нябесная затока
беластоцкага фарнага касьцёлу
сапраўды
цяжка і знайсьці

* * *

у невялічкім цягнічку
што шыбуе ў бок
першай польскай станцыі
кантрабандысты навучаюць мяне
як трымацца з польскімі памежнікамі
пры гэтым неяк шматзначна
паглядаюць на мяне
як быццам даюць зразумець
ведаем што ты за гусь
але можаш на нас разьлічваць

* * *

у Беластоку вуліца Ліповая
вядзе да храму

у залежнасьці ад таго
зь якога боку
будзеш ісьці
выйдзеш
або да касьцёлу
Сьвятога Роха
або да чырвонай
гатычнай фары

пры гэтым
як бы ні пайшоў
аніяк не абмінеш
царкву Сьвятога Мікалая
якая месьціцца
якраз на сярэдзіне
шляху

* * *

Fleetwood mac
такім знаёмым голасам
зь беластоцкай FM-кі
запрашае да гарбаты

кіпень сапраўды ўжо гатовы
і лусьцікі накроены

дваццаць восемь гадоў таму
пад Fleetwood Mac
пры выключаным сьвятле
мы танчылі
на маіх провадах у войска

і цалаваліся
і марылі
і абяцалі

мары ня спраўдзіліся
абяцаньні даўно парушаны
засталіся толькі ўспаміны
пра дотыкі дзявочых вуснаў

* * *

цыганка на беластоцкім кірмашы
прапаноўвае мінакам набыць бінокль
мінакі адмаўляюцца нават
паглядзець праз яго акуляры
напэўна таму
што баяцца падману

бо
і павелічэньне
і памяншэньне
па сутнасьці ўжо ёсьць падман

* * *

прыехаў у Белавескую пушчу
паглядзець на зуброў
з польскай прапіскай
і ня ўбачыў ніводнага

напэўна спужаліся
што забяру з сабой у Беларусь
і пахаваліся ў кустоўі сваіх вальераў

затое пабачыў вялізнага
быка-мутанта
які нарадзіўся
ад экспэрымэнтаў спарваньня
зубра і хатняй каровы

усе мастакі сьвету
малявалі менавіта такога быка
на сваіх карцінах «Выкраданьне Эўропы»

* * *

на беластоцкім кірмашы на Антанюках
дзе прадаюць па нядзелях
розныя старыя рэчы
ад нямецкіх касак
да клямак ад вясковых хатаў
набыў жменю манэтаў
з выявамі польскіх каралёў

сьведкі падзеяў
здабыцьця волі

манэты ў сто і пяцьсот злотых —
як аповед
пра годнасьць
патрыятызм цяжкасьці
і трываньне

## *АГУЛЬНАЯ СПРАВА АДЗІНАЦЦАЦІ*

адзінаццаць чалавек
сядзяць на падсуднай лаве
у Беластоцкім раённым судзе

Алега Латышонка
як сьведку па справе
выдаляюць з судовай залі

не бяда —
двухмэтровы Алег бачыць здалёку

Лена Глагоўская выкладчыцкім позіркам
узіраецца ў мяне —
спрабуе пазнаць

мы ня бачыліся бадай гадоў дзесяць

разам зь Мірай Лукшай яны сядзяць
паміж двума Яўгенамі —
Мірановічам і Вапай

можна загадваць жаданьне

ня важна
што прачытае пракурор
у абвінаваўчай прамове

ня важна
якія пытаньні задасьць судзьдзя
адзінаццаці падсудным

важнасьць не вызначаецца ў судзе

у адзінаццаці абвінавачаных
ёсьць агульная справа

па якой
свой суворы прысуд
вынясе сама гісторыя

*2006, Беласток*

* * *

цяжка паверыць што недзе
глыбока пад зямлёю
расплаўленая магма
булькоча і пухірыцца
як раз’ятраны бульдог
які ірвецца з прывязі
каб пашкамутаць усё
на сваім шляху

утаймаваная зямной карой
магма не астывае і не супакойваецца
ужо мільярды гадоў

і толькі зрэдку паказвае
свае вогненныя языкі

нагадвае пра сябе

але ніхто ня хоча
тлуміць сабе галаву развагамі
пра агонь нябесны
і агонь падземны
пра недасяжнае
і няўцямнае

толькі агонь у печы
як прыручаная котка
блізкі і зразумелы

і цяжка паверыць
што там пад нагамі
булькоча і пухірыцца
магма

* * *

я хацеў напісаць верш
ды толькі дождж мне перашкодзіў
ён размыў сьцяжыны
і зьнішчыў твае сьляды

цяпер я блукаю
паміж нашымі
першай і апошняй
сустрэчамі

між якімі ўзышла

вясёлка

* * *

сонца як вяшак
на сапсаваных прысосках
звальваецца долу
не трымаецца
як не наракай

штораніцы знаходжу на падлозе
свае ручнікі

* * *

з пігулькай цытрамону
засынаю ў абдымках
як маленькі хлопчык
з плюшавым мішкам
столькі ў гэтага сьвету
праблемаў
што галава ідзе
кругам

* * *

вось і яшчэ адзін год
набліжаецца да скону
пераглядаю свой дзёньнік
занатоўваю апошнія падзеі

нібыта ў бухгалтарскай кнізе
падрахоўваю балянс

* * *

ёсьць адзіны час
і ёсьць безьліч стрэлак
якія гоняцца за ім
па пятах
за кожнай сэкундай
за кожнай хвілінай
за кожнай гадзінай

* * *

зубр у вальеры нічога мне
зноў не паведаміць

хвоі сваімі вершалінамі
па-ранейшаму
падтрымліваюць неба

галоўнае — не страціць раўнавагі

ні аб чым не распытваць зубра
дапамагчы хвоям хаця б на імгненьне

* * *

Жыццё — як рынак, як штрых-коды,
Ці як сняданак на батуце.
Чым больш попыт на свабоду,
Тым больш яна каштуе людзям.

* * *

вясна прыйшла ў лютым
і ўсё пераблытала

пляны колеры думкі сэнсы

на маёй сьцяне вісіць
чыстае палатно
падрыхтаванае для новай карціны

за гэты час так прызвычаіўся
да белага прастакутніка
што аднойчы сказаў

няма чаго тут дадаць
гэта і ёсьць карціна
і назва прыдумалася
сама сабой

люты

і вось прыйшоў новы лагодны люты
і ўсё пераблытаў
і ўсё трэба пачынаць спачатку

думаць
вырашаць
што намаляваць на палатне

*2008*

# ЗМЕСТ

## ня ў нас усё
## але праз нас

## побач Пліса гайдае на сваіх хвалях белатварыя лілеі



## я пачую я адгукнуся

## вясна прыйшла ў лютым і ўсё пераблытала